Пасвяты “Зямля пад белымі крыламі” 2023 год

Настаўнік пачатковых класаў
З.М.Аблажэй

Я хачу з табой усім дзяліцца –
З той зямлёю, на якой жыву,
Што ад кожнай хаты да сталіцы
Бацькаўшчынай роднаю заву.

Сыпле звон жаўрук з нябёснай высі.
А пад ім квяціста – зеляно.
У полі колас спеласцю наліўся.
Бусляняткі сталі на крыло

Як сваё, тваё я сэрца чую.
Лёс у нас адзін, адна душа.
Я з табой спяваю і жалкую –
Над калыскай і каля крыжа.

Я красы тваёй не параўнаю
Ні з якою ні ў якіх краях,
Сіняя, бялюткая, зямная
І зеленакосая мая

Нам пашчаслівілася нарадзіцца і жыць на беларускай зямлі. Мы жывём у цудоўнай дзяржаве і з’яўляемся яе грамадзянамі, ее народам. Беларусь, самая прыгожая, самая любая краіна. Ты жывеш тут, тут жывуць твае мама і тата, бабуля і дзадуля.
Сімвалам нашай краіны з’яўляецца белы бусел. У народным фальклоры буслы вядуць сваё паходжанне ад людзей і нават ад анёлаў. Буслы ахоўвалі жытло, былі ўзорам сумлення і вернасці.

Няма радзімы без бацькоўскай хаты:
Бусліны клёкат – гэта родны дом;
Ты будзеш жыць шчаслівa і багата,
Калі над хатай – буслава гняздо

Беларусь – гэта залатыя палі збажыны з сінімі вочкамі васількоў, светлыя ад бяроз гаі, што аглухлі ад птушынага звону, і пушчы, дзе горда нясуць сваі кроны алені. Гэта бясконцыя жылы рэк і чыстыя як усмершка – азёры.

Зямля з блакітнымі вачамі
Святло азёр, прастор лугоў! –

Тут называюць Васількамі
На Беларусі хлапчукоў
Звіняць крыніцы, як цымбалы,
Сцяжынкі свецяць у лясах
Палі, узгоркі, перавалы –
Прасторны шлях, далёкі шлях

Беларусь багата на славутыя імёны, якія яркімі зоркамі ззяюць нам праз стагоддзі. Мы помнім Ефрасінню Полацкую, Якуба Коласа, Янку Купалу. Славутыя імёны роднай зямлі Адам Міцкевіч, Самсон Пярловіч.

Мой родны кут, як ты мне мілы
Забыць цябе не маю сілы
Не раз, утомлены дарогай
Жыццём вясны маёй убогай
К табе я ў думках залятаю
І там душою спачываю

Беларуская зямля заўсёды славілася сваімі людзьмі: добрымі, шчодрамі, таленавітымі, працавітымі. Вельмі радасна, што традыцыі нашых продкаў захаваліся і мы маем цудоўную магчымасць пабачыць на свае вочы прыгажосць працы чалавечых рук. Звярніце ўвагу на нашу выставу. Вышыўка былой вучаніцы школы Пярловіч Анастасіі.
Мая Беларусь. Па нашых землях таптпліся прышэльцы, ворагі. Нішчылі людзей, палілі хаты, гарады. Ніколі і нікому не ўдавалася зняволіць вольналюбівы народ.
Званы Хатыні, мемарыял у Брэсцкай крэпасці – героі нагадваюць “Людзі!” “Помніце!” не дапусціце новай вайны!
Нашы ветэраны землякі: Буцкевіч М.П., Стэльмах К.М. Вечная памяць землякам, якія загінулі ў часы вайны і якіх няма побыч з намі.

Шануйце родны край, Айчыну.
Тых, хто яе абараняў
Хто ў бітвах з ворагам загінуў,
Хто перамогу атрымаў

Родная замля, любая Беларусь! Вось яна – святая зямля дзядоў і прадзедаў, зямля гераічнай славы,
О Беларусь, мая калыска,
Жыццё маё, прытулак мой!
З гарачаю любоўю нізка
Схіляюся перад табой.

Зямны паклон табе, Радзіма,
Тваім палям, тваім лясам,

Тваім заводам з белым дымам,
Тваім гасцінцам і шляхам.

Родная зямля! Родны кут! Гэта святло роднага дома. Дзе так спакойна і па-дзіцячы спіцца, дзе пахне мамай, дзе пакой і цеплыня.

Фрагмент урока роднай мовы з вучнямі 1 класа
Віншаванні ад бацькоў
Віншаванне ад дырэктара школы
Віншаванні ад вучняў 1-9 класаў

Мову родную беражы
Мовай роднай даражы
Мову родную шануй
Мовай роднай не гандлюй
Мову родную любі,
Мову ў сэрцы не губі.
Мовы роднай не кідай
Мову дзецям передай
Мовы не аддай на здзек
Толькі з ёю жыцця век